УДК 94 (476)

# Мінскае гета (ліпень 1941 – кастрычнік 1943) - трагедыя беларускіх яўрэяў

Тукала С.М.
Беларускі дзяржаўны універсітэт

Ахвярамі расізму ў гады Вялікай Айчыннай вайны былі не толькі славянскія народы - беларусы, рускія, украінцы, палякі, чэхі, але і грамадзяне яўрэйскай нацыянальнасці. Нацысцкай палітыкай Трэцяга Рэйха ўсе яўрэі, якіх Германія лічыла "першым ворагам", другой па значнасці, пасля партызан, варожай групоўкай, якая на думку прадстаўнікоў нямецкай эліты быццам бы прэтэндавала на сусветнае панаванне, былі асуджаны на сістэматычнае, паступовае і масавае вынішчэнне на ўсёй тэрыторыі СССР. Дзеля гэтага гітлераўцы распрацавалі план "канчатковага вырашэння яўрэйскага пытання" - фізічнае знішчэнне ўсіх яўрэяў, нягледзячы нават на тое, што яны перайшлі ў хрысціянства.

Вялікая Айчынная вайна была катастрофай для беларускіх яўрэяў, а сталіцу нашай краіны немцы абралі ў якасці "навуковага цэнтру" па апрацоўцы метадаў хуткага знішчэння людзей. Гэта катастрофа пачалася ў Мінскім гета, буйнейшым гета - канцлагеры на акупаванай тэрыторыі Беларусі. Так 19 ліпеня 1941 года выйшаў загад, падпісаны камяндантам 812 палявой камендатуры, дзе адзначалася, што ўсе яўрэі павінны "в обязательном порядке" перасяліцца ў сталічнае гета [1, арк.1-2]. Былы яго вязень Х.І.Рубінчык узгадвае наступнае: "...согласно приказу полевого коменданта переселение должно было начаться после обнародования приказа, то есть 20 июля 1941 г. и завершиться в течение 5 суток. Но на практике оно продолжалось до августа. С 1.8 гетто было уже оформлено..." [2, с.179-180].

У тэрыторыю гета ўвайшло каля 40 вуліц і завулкаў у паўночна – заходняй частцы горада ў раёне Юбілейнай плошчы [3, арк. 5-7]. Яўрэям забаранялася знаходзіцца па-за межамі гета, яны ўключаліся ў працоўныя калоны. На грамадзян яўрэйскай нацыянальнасці накладвалася вялізная кантрыбуцыя [1, арк.1-2]. Вязні гета павінны былі насіць на адзенні спецыяльныя апазнавальныя знакі: паўкруглыя жоўтыя латы для ўсіх;

чырвоныя – для тых, каго выкарыстоўвалі на працы; зялёныя – для ўтрыманцаў і непрацуючых яўрэяў [4, арк. 4]. Становішча яўрэяў было проста жахлівым: у гета не было лазні, электраэнэргіі, вязні жылі ў антысанітарных, нечалавечых умовах, іх прымушалі выконваць самую цяжкую і непатрэбную працу: "перевозить песок и глину с одного места на другое и обратно, копать землю без лопат. Рабочим выдавали 200 граммов хлеба и один раз в день мутную водичку, именуемую супом" [5, с. 111]. "Население гетто использовали на чёрных работах – по очищению улиц, в районе товарной станции ... Примерно на площади из 10 кв. м жило 6-8 человек ... выходило 1.5 метра на человека..." [2, с.179-183].

Вязні Мінскага гета са жніўня 1941 па кастрычнік 1943 гады пабачылі шматлікія аблавы, страшэнныя пагромы, пастаянныя здзекванні, бандыцкія начныя налёты. Так 7 жніўня 1941 года была праведзена першая аблава, калі немцы знішчылі 800 чалавек мужчын [6, с.4]. Гэтыя аблавы практыкаваліся амаль кожны тыдзень: гінулі ні ў чым не павінныя людзі – дзеці, жанчыны, старыя, якія сталі ахвярамі палітыцы генацыду.

7 лістапада 1941 года ў Мінскім гета адбыўся першы масавы пагром, калі загінула каля 12 тыс. чалавек [7, с.51]. На жаль, наступныя пагромы па колькасці ахвяр амаль не адрозніваюцца ад першага, фашысты з пунктуальнасцю, на практыке, здзяйснялі "канчатковае вырашэнне яўрэйскага пытання": 20 лістапада 1941 года знішчаны - каля 7 тысяч; 2-3 сакавіка 1942 года - амаль 5 тысяч; 28 – 31 ліпеня 1942 года - каля 30 тысяч яўрэяў [6, с. 4].

Восенню 1942 года пасля шматлікіх пагромаў, налётаў, аблаў, у Мінскім гета налічвалася яшчэ 9472 яўрэя [8, арк. 18]. Трэба адзначыць, што з гэтай колькасці вязняў 7891 чалавек з'яўляліся непрацаздольнымі [9, с. 4].

З чэрвеня 1943 года пачалося сістэматычнае знішчэнне працоўных калон у Мінскім гета. Гэта быў пачатак канца. У верасні 1943 года ў сталічным гета засталося каля 2000 вязняў [10, с. 127]. Фіналам трагедыі Мінскага гета былі 3 дні ў канцы кастрычніка 1943 года. Па задуме акупантаў, астатняе яўрэйскае насельніцтва неабходна было накіраваць за горад да месц "экзэкуцыі" і знішчыць. Былы вязень гета А. Рубенчык узгадвае, што "с вечера 20 октября 1943 года территория гетто была

окружена войсками СД и полицейскими батальонами. Утром следующего дня всех евреев погрузили в машины и вывезли в Тростенец” [11, с. 166-167].

Колькі ж яўрэяў было знішчана на тэрыторыі Мінскага гета з лета 1941 па восень 1943 гады? На гэта пытанне нельга даць стопрацэнтны адказ. Так у 5 таму Кароткай яўрэйскай энцыклапедыі ёсць дадзеныя, што ў сталічным гета толькі 13 яўрэяў выратавалася і 80 тысяч было знішчана [12]. Хаця гэту лічбу можна лічыць мінімальнай. Яшчэ ў 1944 годзе Беларуская рэспубліканская камісія садзейнічання ў працы Надзвычайнай Дзяржаўнай Камісіі па расследванню і ўстанаўленню злачынстваў нямецка – фашысцкіх захопнікаў паведамляла, што “в специальном лагере – гетто в г. Минске было истреблено до 100 тысяч человек еврейского населения, значительная часть которого была привезена для уничтожения из других стран Западной Европы: Голландии, Австрии, Чехословакии” [13, арк. 107]. Па апошнім падлікам гісторыка Л. Смілавіцкага ў Мінскім гета загінула каля 130 тысяч чалавек - 85 тысяч сталічных яўрэяў, 10 тысяч з прыгарадных мястэчак і 35 тысяч яўрэяў, дэпартаваных з еўрапейскіх краін [14].

**Літаратура**

1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф.359. Воп.1. Спр. 8.
2. Холокост в Беларуси. 1941–1944. Документы и материалы.– Мн., 2002.
3. НА РБ. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 926.
4. НА РБ. Ф. 359. Воп. 1. Спр. 19.
5. Гроссман,В., Эренбург,И. Чёрная книга. Вильнюс. 1993.
6. Жизнь и гибель Минского гетто (Публикация Музея ист. и культ. евреев Беларуси) // Авив. 2003. 19 октября.
7. Иоффе, Э. Минское гетто: Основные этапы истории // Мінскае гета. 1941 – 1943 гг.: Трагедыя. Гераізм. Памяць. Матэрыялы міжнар. навук. канферэнцыі. – Мн., 2003.
8. НА РБ. Ф. 370. Воп. 1. Спр. 473.
9. Из отчёта немецкого комиссара г. Минска В. Янецке о положении в городе. 3 декабря 1942 г., г. Минск // Авив. 2003. 19 октября.

10. Иоффе, Э.Г. Страницы истории евреев Беларуси: краткий научно-популярный очерк. – Мн., 1996.
11. Рубенчик, А. Правда о Минском гетто. Документ. повесть узника гетто. - Тель - Авив. 1999.
12. Краткая еврейская энциклопедия. Т.5. Гл.ред. И.Орен, Н. Прат. – М., 1995.
13. НА РБ. Ф. 845. Воп. 1. Спр. 21.
14. Смиловицкий, Л. Катастрофа евреев в Белоруссии. 1941-1944. - Тель-Авив. 2000.

УДК 9(476)

## Характер военно-политических планов нацистской Германии в отношении Беларуси накануне Великой Отечественной войны

Козел Д.А.
Белорусский национальный технический университет

Выяснение сущности военно-политических планов высшего руководства Германии в отношении Белоруссии нельзя провести без глубокого осмысления характера нацистской военно-политической политики и выявления методов ее проведения на оккупированной территории.

Как известно, основу политики лидеров третьего рейха в отношении захваченных территорий Восточной Европы определяли нацистские концепции «расовой теории» и «геополитики». Наиболее полно они были изложены А. Гитлером в книге «Mein Kampf», где он не только проповедовал «движение на Восток», но и определил методы и цели этого движения, обосновывая их теорией «нехватки жизненного пространства для немецкого народа». Итогом программы А. Гитлера на пути к мировому господству стал план войны против СССР – «Барбаросса», в основу которого была положена идея молниеносной войны.

Германская политика в отношении к будущему "жизненному пространству" нашла свое закрепление во многих документах подготовленных еще до начала агрессии против СССР. Главные направления этой политики были изложены рейсхфюрером СС